

# Асоба Кастуся Каліноўскага

***Лепш буду я попелам, чым пылам! Хай лепш згасне маё полымя ў асляпляльнай успышцы, чым плесня задушыць яго!***

***Джэк Лондан***

# Асоба Кастуся Каліноўскага

## *Мэты ўрока:*

- *пачаць вывучэнне жыцця і дзейнасці Кастуся Каліноўскага  - барацьбіта за свабоду і незалежнасць простага народа;*
- *удасканальваць навыкі стварэння канспекта.*

# Канстанцін Вінцэнт Каліноўскі

Нарадзіўся будучы кіраўнік народнага паўстання на Беларусі ў 1838 годзе на Гродзеншчыне, на хутары Янушкоўка, якім валодаў бацька. Каліноўскія – прадстаўнікі шляхецкага роду, вядомага яшчэ з 17 стагоддзя. У 2-й палове 18 ст. маёнтак, які належаў сям'і, быў прададзены, і Каліноўскія сталі беззямельнай шляхтай.



# Дзяцінства

**Маці**, Вераніка Рыбінская, памёрла маладой, калі Кастусю было 5 гадоў.

**Бацька**, Сямён Сцяпанавіч, быў разумным і энергічным чалавекам. У вёсцы Мастаўляны на зямлі памешчыка Радавіцкага ў 1835 ён заснаваў невялікую ткацкую фабрыку (па сутнасці майстэрню), дзе выраблялiся сурвэткі, абрусы і іншыя льняныя вырабы.

# Дзяцінства

Потым разам з другой жонкай, Ізабелай Лазарэвіч, набыў невялікі фальварак Якушоўка паблізу мястэчку Свіслач у Ваўкавыскім павеце. Туды ў 1849 перабралася сям'я, а таксама была пераведзена фабрыка.

У 1855 бацька дамогся зацвярджэння сенатам Каліноўскіх у дваранскіх правах. Але матэрыяльнае становішча сям'і, у якой ад двух шлюбаў было 18 дзяцей, па-ранейшаму заставалася цяжкім.



# В у ч о б а

У 1847 Кастусь паступіў у першы клас Свіслацкай гімназіі, вядомай не толькі педагагічнымі дасягненнямі, але і багатымі традыцыямі ўдзелу навучэнцаў у вызваленчай барацьбе.



# В у ч о б а

Вялікі ўплыў на Каліноўскага зрабіў яго старэйшы брат Віктар. З ім Кастусь Каліноўскі прыязджае ў Пецярбург і паступае на юрыдычны факультэт. Сваім духоўным ростам, матэрыяльнай забяспечанасцю ён абавязаны свайму брату, таму што той быў яго аднадумцам, духоўным

# В у ч о б а

*Да заканчэння універсітэта Каліноўскі прыйшоў не толькі з трывалымі ведамі ў галіне юрыспрудэнцыі, эканомікі, гісторыі, але і з перакананнем, што свае веды трэба паставіць на службу свайму народу. Яго чакала кар'ера юрыста, адміністратара, але ён выбраў іншае – барацьбу за волю народа.*

# В у ч о б а

*Студэнцкія гады мелі вырашальнае значэнне для станаўлення рэвалюцыйнага светапогляду Каліноўскага. У тыя бурныя часы ў студэнцкім жыцці будучы кіраўнік народнага паўстання неаднаразова выбіраўся бібліятэкарам-кіраўніком арганізацыі студэнтаў "Огул" - выхадцаў з Польшчы, Беларусі, Літвы і Украіны, узначальваў у "Огуле" найбольш радыкальнае крыло.*

# В у ч о б а

З утварэннем каля 1858 у Пецярбургу ваенна-рэвалюцыйнай арганізацыі Серакоўскага-Дамброўскага браты Каліноўскія сталі яе актыўнымі дзеячамі. Жылі яны ў Пецярбургу на заробкі Віктара, які перапісваў гістарычныя дакументы, і невялікую стыпендыю, прызначаную Каліноўскаму ў 1858. Каб здабыць дадатковыя сродкі, Кастусь займаўся рэпетытарствам, а нярэдка быў вымушаны звяртацца за дапамогай у рэктарат.

# В у ч о б а

*Вядома таксама, што ён цяжка хварэў, асабліва ў кастрычніку 1859. Тым не менш ён выдатна вучыўся і летам 1860 паспяхова скончыў універсітэцкі курс, а пасля падачы дысертацыі ў студзені 1861 зацверджаны папячыцелем Пецярбургскай навучальнай акругі ў ступені кандыдата правоў.*

# В у ч о б а

Атрымаўшы ў лютым 1861 дыплом, ён праз 2 тыдні быў ужо ў Вільні, дзе зрабіў безвыніковую спробу ўладкавацца на службу ва ўпраўленне мясцовага генерал-



# Ф і з к у л ь т х в і л і н к а



# П а л і т ы к а

Вяртанне Каліноўскага на радзіму супала з моцным уздымам вызваленчага руху на Беларусі і ў Літве, выкліканага абвяшчэннем сялянскай рэформы і абвастрэннем палітычнай сітуацыі ў Расіі і Польшчы. Кастусь Каліноўскі стаў адным з правадыроў гэтага руху, лідэрам яго дэмакратычнай плыні ("чырвоных"). На працягу 1861 ён стварыў на Гродзеншчыне з разначыннай інтэлігенцыі нелегальную рэвалюцыйную арганізацыю, звязаную з такімі ж арганізацыямі ў Вільні.

# П а л і т ы к а

Каліноўскі і яго прыхільнікі вялі па вёсках і мястэчках агітацыю сярод сялян, заклікалі іх на барацьбу з памешчыкамі і самаўладствам. Разам са сваім сябрам В.Урублеўскім, беларускім паэтам Ф.Ражанскім і інш. паплечнікамі па гродзенскай арганізацыі летам 1862 ён распачаў выданне першай у гісторыі Беларусі нелегальнай рэвалюцыйна-дэмакратычнай газеты "Мужыцкая праўда".


№ 1.

MUZYCKAJA PRAUDA

Dzieciuki!

# П а л і т ы к а

На працягу 1862-63 удалося выдаць 7 нумароў, аўтарам і рэдактарам большасці з якіх быў сам Каліноўскі. "Мужыцкая праўда" ўпершыню на беларускай мове несла рэвалюцыйна-дэмакратычныя ідэі ў асяроддзе сялянства, рыхтавала яго да паўстання.

www.hebus.com

# Палітыка

**Каліноўскі асабіста ўдзельнічаў у распаўсюджванні газеты, дзёрзка раскідваючы яе на дарогах Слонімшчыны. Пасля таго як мясцовыя ўлады аддалі загад пра яго арышт, ён цалкам перайшоў на нелегальнае становішча, хаваючыся пад <u>рознымі прозвішчамі (Макарэвіч, Хамовіч, або Хамуцiўс, Чарноцкі і інш.).</u>**



# П а ў с т а н н е

Пасля выбуху паўстання ў Польшчы (студзень 1863) Літоўскі правінцыяльны камітэт заклікаў народы беларуска-літоўскага краю да актыўных дзеянняў і абвясціў сябе Часовым рэвалюцыйным урадам Літвы і Беларусі.

З вясны 1863 Каліноўскі - рэвалюцыйны камісар на Гродзеншчыне, працаваў у Беластоку і Гродне, шмат зрабіў, каб зламаць сабатаж памешчыкаў і ўцягнуць у паўстанне народныя масы.

**Д з е й н а с ц ь**

*Хутка ў паўстанцкай арганізацыі адбыўся новы пераварот, "чырвоныя" зноў узялі ўладу ў свае рукі, і Каліноўскі ўзначаліў віленскі паўстанцкі цэнтр.*

**Д з е й н а с ц ь**


За кіраўніком паўстання ўлады
арганізавалі сапраўднае паляванне. Але
ён працягваў мужную барацьбу,
мяняючы аблічча, імёны, адрасы.
Д з е й н а с ц ь

# А р ы ш т

У кастрычніку 1863 Каліноўскі пад імем Ігната Вітажэнца пасяліўся ў так званых Святаянскіх мурах (комплекс будынкаў былога Віленскага універсітэта), насупраць генерал-губернатарскага палаца, дзе жыў душыцель паўстання Мураўёў-вешальнік.

# А р ы ш т

**Псеўданім і адрас кіраўніка паўстання выдаў жандарам на допытах у Мінску ўдзельнік паўстанцкай арганізацыі В. Парфіяновіч.**

# А р ы ш т

Уначы
10 лютага 1864 года
квартал быў акружаны,
Каліноўскага арыштавалі.

# А р ы ш т

Ноччу 10 лютага 1864 года ўсе сумежныя з касцёлам Святога Яна кварталы акружылі жандары.

- Прозвішча?

- Ігнат Вітажэнец…

- Узяць яго! Гэта Каліноўскі…

# А р ы ш т

Жандары схапілі Каліноўскага і кінулі ў Святаянскія муры, як называлі Віленскую турму. Допыты не зламалі юнака.

<u>Ён нікога не выдаў з баявых сяброў, не заплямiў сябе здрадай.</u>

# Т у р м а

Чалавек вялікай сілы духу, пачуцця ўласнай годнасці і мэтанакіраванасці, Каліноўскі паводзіў сябе ў час следства і суда вельмі мужна, у турме напісаў і здолеў перадаць на волю "Лісты з-пад шыбеніцы" - сваё ідэйна-палітычнае завяшчанне.



# С м е р ц ь

Асуджаны царскім ваенна-палявым судом, паводле канфірмацыі Мураўёва ён быў публічна павешаны ў Вільні на гандлёвай плошчы Лукішкі. Цела рэвалюцыянера паводле тагачасных правіл закапалі на месцы пакарання.

Пазней яго прах тайна перанеслі на тэрыторыю Віленскай цытадэлі. Лічыцца, што рэшткі Каліноўскага, як і іншых змагароў 1863, пакараных смерцю ў Вільні, пахаваны на вяршыні гары Гедыміна, якая знаходзілася ў той час на тэрыторыі цытадэлі.

Кажуць, нібыта Юлій Цэзар, праслухаўшы пра жыццё Аляксандра Македонскага, усклікнуў: “23 гады і нічога не зроблена для бессмяротнасці!” Каліноўскаму было 26 гадоў.

DEEPNESS DAWN
WWW.ARTOFGREGMARTIN.COM

# Значэнне дзейнасці Кастуся Каліноўскага

*Ён выступаў супраць рэакцыйных забабонаў, паводле якіх быццам бы толькі выбраныя здольныя вучыцца і займацца навукай. Галоўнай умовай пашырэння асветы Каліноўскі лічыў карэнную змену існуючых сацыяльна-палітычных адносін. Пакуль народ не будзе свабодны, не будзе ні справядлівасці, ні багацця, ні навукі.*

# Значэнне дзейнасці Кастуся Каліноўскага

*Рэвалюцыянер выказваўся за ўсеагульную адукацыю і выхаванне, якімі будзе займацца непасрэдна дзяржава, за тое, каб школа фарміравала ў дзяцей высокія грамадскія якасці і гуманістычныя ідэалы. Ён лічыў за неабходнае развіваць асвету і навуку на роднай беларускай мове.*



# Дамашняя работа:

- карыстаючыся канспектам, падрыхтавацца да праверачнай работы па біяграфічных звестках Кастуся Каліноўскага (праверачная работа ў выглядзе тэста);

- стар. 201-204 прачытаць, прааналізаваць, адказаць на пытанні.



# Пытанні вучням:

- Як вы зразумелі: Кастусь Каліноўскі… Якім быў чалавек, што насіў гэтае імя?
- Чым праславіўся гэты чалавек?
- Якія факты з яго жыцця запомніліся вам больш і чаму?



# Пытанні вучням:

- Якую адукацыю набыў Кастусь Каліноўскі і дзе?
- Як называлася газета, якую выпускаў Кастусь Каліноўскі?
- Колькі нумароў “Мужыцкай праўды” ўбачылі свет?



# Пытанні вучням:

- Дзе было напісана “Пісьмо з-пад шыбеніцы?”
- Ці можна назваць Кастуся Каліноўскага сапраўдным патрыётам?
- Чаму? Паразважайце.

**Падзяліцеся, з якімі эмоцыямі вы пакідаеце кабінет?**

**Ці спадабаўся вам сённяшні ўрок?**



# Да пабачэння!

